# “Гармония”

Литературный альманах

№3

Смолевичи, 2020

Анна-Мария Ситникова

## ВАРЕНЬКА

Золотилась над лесом радуга, дождём обласкана.
Оберегом в корзине ивовой ромашек цвет.
Заблудилась под трели зяблика. Льняными глазками
Незабудки глядят задумчиво ушедшей вслед.
У болота багульник кипенный дурманом вцепится,
Под ракиту заманит хрупкую – засни-усни.
Оставайся навечно, милая, ты с нами, девица,
Позабудешь про лето жаркое, шальные дни.
Не беги: в полушубке бархатном, пуховых варежках
Из-за северной снежной Ладоги придёт зима…
По рукам и ногам спелёнута вьюнками Варенька,
А под щёчкой платочек аленький… Баюн-туман
Колыбельную шепчет ласково, паучьи стражники
Оплетают шелками косыньки. Крадётся сон...
И слагают недаром жители рассказы страшные
О пропавшей когда-то девушке в краю лесном.
Не бродите медвежьи-волчьими ходами-тропами,
Не летите гусями серыми к исходу дня
Разговоры и песни грустные. Взойдут над топями
Золотые Стожары-искорки, секрет храня,
О любви, что под сердцем спрятана. Ах, Варя-Варенька…
На гречишном хмелю и радости… Судья не бог.
По-над лесом раскаты-молнии, поют комарики.
И летит лепестком ромашковым последний вздох.



## Анна-Мария Ситникова

### ЧЁРНОБЕЛОЕ

Был розов дым. Поднявшись к небесам,
В зелёных тучах растворялся, таял.
И падал дождь, что реки набросал,
Бесцветный дождь, воспетый днями мая.
И всем законам божьим вопреки
Цветами синеглазыми пылала,
Укрыв лиловый пепел дна реки,
Тонюсенькая ветка краснотала.
Плыла весна над палевой землёй.
Гудели камни, птицам белым вторя.
Всё это было. Поросло быльём –
Чернобыльской травой с оттенком горя.



## Анна-Мария Ситникова

### В ПАРКЕ

Парк заброшенный. Ветви тонкие.
Грязь дорожная. Хмарь небес.
Ветер снежные тучи комкает,
Снег бросает. Весне-судьбе
В этом марте, холодном, горестном,
Нет ни шанса. А, может? Там –
Солнце яркое вход над городом
Плавит лазером. Всем постам
Весть несут воробьи-разведчики:
«Жить по-новому!» Рыжий кот,
Тот, что был с колбасой замеченный,
Вмиг прощён. У стальных ворот

Дворник, мусор гоняя веником,
Сквозь усы про любовь поёт.
Две голубки на кепке Ленина
Чистят перья. Ломают лёд
С громким хрустом мальчишки. Крутится
Дог-щенок под задорный свист…
В парке чудо сегодня сбудется –
Тополь нежный раскроет лист.



## Саша Морозов

### ЖИЛ ЧЕЛОВЕК

Жил человек. Жил.
Рвал кружева жил.
Плёл узелки дел.
Жил человек. Ел.

Ел человек. Спал.
Брал высоту скал.
Был на виду весь.
Жил человек здесь.

Не принимал ложь.
Не убирал трап.
Был он почти вождь.
Был не совсем раб.

Жил не щадя лат.
Был не всегда свят.
Сверху смотрел Бог –
Жил человек в долг.

Каждому свой срок!
А остальным – сил!.
Как человек мог –
Так человек жил.

Вот вам почти быль
Вот вам и весь сказ,
А человек жил
Только один раз.

## Саша Морозов

## ПРОШЛОГОДНИЕ ВОКЗАЛЫ

прошлогодние вокзалы
приказали долго ехать
разливать тоску в стаканы
беспростынно но уснуть
там откроются сезамы
дамы точеные мехом
здесь короткие романы
сокращают долгий путь

замелькают параллельно
тени мелких полустанков
чья природная оседлость
семафорит просто так
так уютно и пастельно
с пивом разделить таранку
вздрогнуть с новеньким соседом
старомодным стыкам в такт

там вчерашние заботы
обездвиженного быта
здесь очаг транзитных истин
согревает без угля
здесь и спор уже до рвоты
здесь и истины избиты
там заоблачно лучисты
заоконные поля

здесь гуляет по плацкарту
аромат еды дорожной
сложно  выдумать изыски
собираясь второпях

посылаясь к чёрту в ялту
можно впасть в неосторожность
загреметь в стальные списки
с первым встречным на паях

убывает безутешно
серп луны незваным гостем
в упоительном рассоле
тонет пыль перронных драк
там фортуна фыркнет решкой
здесь удача бросит кости
все при деле каждый в доле
вам купейный или как?
4.04.2019



## ПРОЗА

### Уладзіслава Люсікава

## Дрэва

У звычайным горадзе на плошчы, каля цэнтральнай вуліцы, дзе нават самыя адхіленыя вочы звярнуць ўвагу на бурленне мясцовага жыцця, стаіць дрэва. Напудраныя яркімі фарбамі ад глыбокіх слядоў часу будынкі, роўна ішлі побач дарогі. У іх размяшчаліся прадуктовыя крамы, цырульні або проста кафэ, якія моцна вылучаліся разнастайнасцю каляровай палітры і тэхнічнымі навінамі ў параўнанні з адзінокім касматым дрэвам пасярэдзіне плошчы.

Стаіць дрэва тут так даўно, што здаецца было заўсёды. Тоўсты ствол ўжо даўно, дасягнуўшы піка росту, падзяліўся на тры часткі, і працягваючы выгінацца, дасягнуў дзіўнай вышыні. Тонкія галінкі плаўна пампаваліся за паветрам, а ўвосенню, калі ўсе галіны з радасцю скідвалі пажоўклую цяжкасць, доўгія лісточкі танчылі ў паветры і плаўна ўладжваліся на асфальт.

Кожны, хто праходзіў недалёку заўсёды звярталі сваю ўвагу на дрэва. Некаторыя маглі падысці да яго, дакрануцца да шурпатай кары, ці прайсці паміж галінамі, якія пяшчотна слізгалі па твары і плячах. Людзі ўзмахвалі рукамі і гучна смяяліся, не задумваючыся аб магчымым сораму.

На плошчы сонца грэла асабліва моцна. Толькі вакол самого дрэва расла маленькая трава, а вакол ляжала вузорная плітачка. Ад яе ўздымаўся скавальны жар, які хапаў мінакоў за шчыкалыткі, ад чаго людзі часцей падымалі ногі і хаваліся пад дрэвам. Асабліва часта можна было ўбачыць пад ім жанчын с каляскамі.

Само ж дрэва стало сведкам мноства падзей. Кожны чалавек быццам бы мяняўся на вачах, як дзіця, якога з ранняга дзяцінства дрыгатліва з любоўю гадуе маці, пакуль той аднойчы ўпэўненна не развітаецца і не з'едзе вучыцца ў іншы горад. Дрэва назірала каханне і сваркі, радасць і сум людзей. Дрэва таксама ўбачыла, што людзі змяніліся. Яно добра памятала, як аднойчы міма ішлі двое хлапчукоў. Адзін з іх падбег да дрэва, запхнуў змяты пластмасавы шклянак у невелікую шчыліну, і адначасова неяк няўпэўнена адступіўся ў нерашучасці. Яго сябар, які стаяў побач, засмяяўся і сказаў: «Што гэта ты, як чарапаха? Давай хутчэй! Карчакі не гавораць і нічога не адчуваюць».

Ды і сам горад змяніўся да непазнавальнасці. Маленькія драўляныя хаткі ператварыліся ў каменныя будынкі, што цягнуліся ўсё вышэй і вышэй. На некаторых будынках з’яўляліся шыльды цікавых формаў. Па начах фасады пустых будынкаў запальваліся мноствам лямпачак розных колераў. Станавілася ўсё больш каменных дарожак і асфальту, і менш зялёнага.

У горадзе была позняя восень. Усё вакол даўно скінуло лістоту. Клумбы былі вычышчаны. Дрэва спала, перыядычна прачынаючыся, яно па-ранейшаму назірала за людзьмі і гарадской мітуснёй. Неяк да дрэва падышлі некалькі чалавек. Гэта былі мужчыны ў касцюмах, у руках яны трымалі паперы і ўсё нешта выглядвалі. Спачатку яны падышлі да невялікай пустцы, дзе калісьці знаходзіўся будынак у тры паверхі, а потым мужчыны падышлі да дрэва. Адзін з іх спатыкнуўся аб голы корань, а пасля ад злосці замахнуўся і носам абутку стукнуў па яму. Дрэву было балюча, але яно толькі па звычцы скаланула галінкай у бок. Мужчыны нешта зафіксафалі на сваіх паперах і хутка сышлі.

Цьмянасць апошніх дзён восені не спалохала людзей. Шмат жыхароў можна было ўбачыць і вечарам – у скверы былі заняты ўсе лаўкі, а ў крамах доўгія хвасты чэргаў. Дрэва імкнулась атрымаць асалоду ад гэтага відовішча перад тым як надоўга заснуць. Аднак у апошнія дні асаблівай увагай

карысталася і само дрэва. Яшчэ некалькі разоў да яго падыходзілі людзі, але любаваліся яны не тоўстым ствалом і кронай, а доўгімі каранямі ў зямлі.

Зіма не спяшалася прыходзіць у горад. Начамі па вуліцах толькі гудзеў моцны вецер. Вось прайшоў снежань і вялікая частка студзеня, аднак, буйных снегападаў было мала. Сонейка, як і раней грэла днём, людзям было горача, таму не спяшаліся апрануцца ў цёплае адзенне.

Дрэву спалося дрэнна, толькі вось у скверы непадалёк пару клёнаў цешыліся нязвыклым цяплом, а дрэва паўтарала ім: «Не думайце, што гэта добра. Вы ж не зможаце адпачыць, хутка стоміцеся. Толькі не апранайцеся ў лістоту зараз, а што вясной рабіць тады будзеце?». Клёны нават не жадалі чуць дрэва. Занадта яшчэ зялёныя былі.

Праз некалькі тыдняў на месцы пусткі пачалася вялікая будоўля. Хутка ўзвялі падмурак. Зноў каля дрэва з'явіліся мужчыны, толькі цяпер іншыя – не ў тых касцюмах, а ў яркай запыленай вопратцы. У руках трымалі бензапілу і драбінку. Вырашылі пачаць пілаваць з ніжніх галінак. Але дрэву было ўжо не балюча, яно толькі назірала за людзьмі, якія не прыбіралі з рук свае мабільныя і не звярталі на дрэва ніякай увагі. Яно зірнула на маладыя клёны, якія салодка спалі. З ствала пацякла смала, а галінкі падалі на зямлю. Такім быў апошні дзень дрэва, а заўтра тут павінна была быць новая плітка, а зусім хутка сучасны гандлёвы цэнтр.

Людзі зусім лёгка пазбаўляюцца ад каранёў.



Любовь Дерр

## Весеннее Солнышко

Закончилась Зима. И на землю пришла красавица Весна. Но почему она грустная и на плечи тёплый платок набросила? Холодно, неуютно нашей гостье. Ходит, смотрит по сторонам: где же Солнышко? Подняла Весна к небу глаза и громко рассмеялась: «Ах, вот, где ты спряталось!»

А ленивое Солнышко утонуло в пушистых облаках и спит себе. Сладкие сны смотрит, нежится в своей постельке. «Просыпайся, соня, хватит спать», – ласково произнесла Весна. Спящее Солнышко приоткрыло правый глаз и тут же его закрыло. Затем повернулось на другой бок и опять укуталось в одеяло из тучек. Ох, как же ему было лень вставать! Но Весна не отстаёт от Солнышка: то за щёчку ущипнёт, то за нос, усыпанный веснушками.

«Ну, встаю, встаю», – послышался, наконец, недовольный голос сони. Солнышко откинуло лёгкое одеяло и, зевая, потянулось. «Вот и славно. Вставай, тебя уже давно ждут птицы, деревья, трава, и жучки. Надоела им Зима. На Солнышке все хотят погреться. Солнышко умылось, причесалось и поднялось в небо.

Только оно расправило свои лучики, как посыпался мелкий снег. Испугалось Солнышко и хотело снова спрятаться за тучки. «Не бойся, я тебя прикрою от снега. Это Зима злится, пугает тебя», - прозвучал голос Весны. Обрадовалось Солнышко и засветило ещё ярче. А снег быстро растаял под его тёплыми лучами. Зима поняла: не справиться ей с Весной и, ворча, убежала.

Солнышко ещё выше поднялось в небе. Его лучи грели теплей и теплей. Молодая травка, прищурив глаза от яркого Солнца, смело пробивалась из-под земли. Она с любопытством поглядывала вверх, откуда струился тёплый свет на её новый весенний наряд. Целые день травка восхищалась своей нежной красотой. «Ах, как она была молода и хороша!»

Под волшебными лучами Солнца всё вокруг оживало. Шустрые почки на деревьях раскрывались наперегонки, показывая свои нежные листочки. Жучки и букашки выползали на стебельки, освещённые солнечным светом. Они грели свои спинки, брюшки и, закрыв от удовольствия глаза, почёсывались лапками.

Природа нежилась в согревающих лучах после затяжных холодов. А наше Солнышко щедро дарило Земле тепло, свет и свою Любовь. И спать ему уже совсем не хотелось.



## Адам Выгодскі (Вячаслаў Зайцаў)

### паэтычны ўступ да аповесці "Аблога"

Прагрэс, здаровы кар'ерызм –
суцешны, дужа, паратунак…
Цяпер жа, мо, – агратурызм?!
Ці іншы хвацкі накірунак…
Але куды плывеш, панове?
У беспрасветны йнтэрнэт?
Ён не навучыць роднай мове…
Наўкол не шмат яе адмет…
Не цешаць роднай мовай школкі…
Расейскі гоман, на-трасянцы…
А беларускі – зрэдку толькі!
Выходзіць – Беларусіянцы!
Мо, беларусы – па прапісцы?
Стаць нацыяй ёсць, бачна, спроба…
Пакуль жа – лёсу летапісцы…
Хто сёння – беларус-асоба?!
Дык стань жа ёй – і будзь адметны:
ты мовай матчынай узвысся!
І будзеш на ўвесь свет прыкметны!
Пасля тым вечна ганарыся!
К мастацкаму хініся твору,
які культуры ўсёй аснова,
нібы да лесу і прастору,
дзе роднае блукае слова…
Найлепшы, мо, кавалак сала,
і нат тэхнічны суперцуд
адрозняць нас у свеце мала:
ім забыццё і тлен – прысуд!
Нас з гарадскіх пячор на волю
агратурызму мкнуць агіткі,
каб лепш спазнаў сваю ты долю,
ці стрэўся з ёй увачавідкі?
Бо ўсе мы родам будзем з вёскі:
праз пошум бору, пах смаловы,
цнату і бель красы-бярозкі…
ты матчыну згадаеш мову.

І прарасцеш душой занова,

бы з-пад асфальту травіна!
Ты беларус – бо ты вясковы!
… Сплыве прагрэсу навіна…
… Трывожна стала ля ракі,
азёраў, у лясах і хатах:
шныраць наўкола Турдзялкі –
імкнуцца хапнуць забагата…
Вясельны тлум і чадны пах
пад слоўны блуд, вар’яцкі смех
імчаць на “мэрсах” па лугах –
тапчы, глушы… шукай уцех!
Крадком прыватнік завідушчы
паўзе да скарбаў векавых:
пятлю закідвае ля Пушчы…
Маўляў, з краечку… я не з тых…
Я за турызм – не для выгоды.
Я за вясковы ціхі быт…
Каб жыць вучыцца ў прыроды…
За мову я! Інакш – нябыт!



## Александр Ключников

### Март-2013

Я зачем-то возвращался
на круги своя над миром.
Левым галсом, правым галсом.
По чужим ориентирам,
чьим-то звёздам, чьим-то картам,
то краплёным, то размытым,
ледяной любовью марта
напоённый, но не сытый.
Пролетал я над апрелем.
Колоритным и задорным.
Правил буйство акварелей
я крылом шершавым, чёрным.
Плыл над маем недозрелым,
проплывал над блудным летом.
И крылом - пернатым, белым -
с лета смахивал запреты.
Я над октябрём снижался,
чтоб вдохнуть костров осенних.
Левым галсом, правым галсом,
чёрной тенью, белой тенью
нёсся я под колким снегом,
нёсся я над ветром вьюжным.
Звёзды меркли. Даже Вега
стала никому не нужной!
Даже солнце гасло! Гасло,
с курса сваливаясь косо.
Небо стало плотным настом,
нить пути - железным тросом!
Тьма! Ни зги, ни карт, ни лоций.
Стёрлись реки, горы, лица.
Не любить и не бороться -

на лету б заснуть, как птица...

Разнокрылье.
Вот в чём дело!
А не в звёздах, и не в картах.
Я засну.
Будите смело
где-нибудь в районе марта...

## ДЕТСКИЙ УГОЛОК

### Несцяровіч Тамара Іванаўна

## Непаслухмянае бусляня

Свяціла яркае летняе сонейка і хоць яшчэ было вельмі рана, але дзень абяцаў быць гарачым. Бусліха Мара і бусел Шчоўк вырашылі навучыць сваё бусляня Клёку, як правільна паляваць на жаб. Недалёка ад іх гнязда знаходзілася невялікае балотца і рачулка, дзе часта па вечарах квакаюць шмат жаб, якія вельмі падабаліся бусляняці, бо яны былі такія смачныя! І вось наступіў доўгачаканы дзень, калі ён сам зловіць сваю першую жабу.

Бусляня лічыла сябе зусім дарослым і проста раздзімалася ад гонару і таму, напэўна, не вельмі ўважліва слухала пра што яму там гаварылі бацькі - буслы.

– Калі бачыш жабу, то не спяшайся яе адразу хапаць і праглынаць - павучаў сыночка тата бусел. – Жабы могуць быць хворыя альбо памерлыя, і тады ты можаш атруціцца і захварэць,– падняўшы адно крыло распавядаў бусел Шчоўк.

– А яшчэ бываюць прадметы, падобныя на жаб, але не жабы,– дадала мама-бусліха. – Будзь уважлівы, сынок.

«Глупства якое, – думала бусляня. – Што я жабу ад палена ня адрозню, або ад багавіння. Навошта толькі марнаваць час на ўсялякія размовы, лепш паляцець папаляваць і хутчэй паесці».

І вось буслы ўзняліся ў неба. Гэта быў прыгожы палёт велічных птушак. Адразу яны адправіліся на рэчку, дзе ім ўсміхнуўся поспех, і кожны злавіў па смачнай жабе. Бусляня гэта ўсё распаліла і яно адчула сябе дасведчаным паляўнічым і смела вырвалося наперад, імкнучыся на балотца. А недалёка ад балотца, у вялікім і прыгожым доме жыў вучоны, які займаўся вывучэннем прыроднага свету балот. І вось ён пабудаваў механічную жабу, каб яна, не прыцягваючы ўвагі, плавала ў балоце і запісвала на маленькую

відэакамеру ўсё, што робіцца вакол, а потым навуковец збіраўся пaглядзець адсняты фільм і даведаецца, як жывуць у балоце апалонікі, рыбкі і жабы. І зможа расказаць пра гэта ўсім людзям у сваіх артыкулах. Спачатку насельнікі балотца палохаліся вялікай жабы, але, так як яна не прыносіла ім шкоды, то яны да яе хутка прывыклі і спакойна плавалі побач. Механічная жаба была падобная на сапраўдную, але, калі прыгледзецца больш уважліва, то бачныя былі адрозненні. Па-першае яна была больш звычайнай балотнай жабы, па-другое, яна толькі плавала і ніколі не скакала па беразе, і па-трэцяе, яна не квакала.

Але вось паказаліся ў небе нашы буслы. Наперадзе ляцела бусляня, хоць мама і тата папярэджвалі яго, каб яно не вырывалася наперад, пакуль не навучыцца добра лавіць жаб. Але бусляня іх не слухала. Яно лічыла, што усё ведае і пра жаб і пра паляванне, бо яно ўжо злавіла сёння адну жабу. І зрабіла гэта нават хутчэй, чым бацькі. І навошта яны ўвесь час кажуць, каб яно не спяшалася, каб лепш глядзела, каб было больш уважлівым. Яно і так усё ведае пра жаб і няма чаго яго вучыць

Вось і цяпер Клёка першым заўважыў унізе вялікую жабу і хутка спланаваў ўніз. Праўда, мама і тата, што-то там перасцерагаечае крычалі ззаду, але ён іх не слухаў. Ён хутка схапіў велізарную жабу і паспрабаваў праглынуць.

Але не тут-то было. Механічная жаба (а гэта была яна) затрымалася ў яго ў горле, і бусляняці стала зусім дрэнна. Бацькі буслы падляцелі да яго, але яны нічым не маглі яму дапамагчы. Яны толькі кружылі над ім і трывожна крычалі, а Клёка ляжаў у чаротах і задыхаўся. Добра, што крыкі буслоў пачуў навуковец, які ў гэты час ішоў на балотца, каб паглядзець, што запісала яму там механічная жаба. Ён хутка падбег і ўбачыў у чароце, як памірае бусляня. Ён схапіў Клёку і пабег да свайго дома, дзе ў яго былі неабходныя інструменты. Буслы ляцелі следам. Праз некаторы час навуковец дастаў з горла Клёкі сваю механічную жабу і бусляня змагло зноў дыхаць. І яшчэ яно хацела да сваіх бацькоў, якія так яго любілі і берaглі. І калі вучоны адпусціў Клёку да дарослых буслоў, тыя былі такія шчаслівыя, што нават не дакаралі яго за непаслушэнства, хоць страшна спалохаліся за свайго сыночка. Але бусляня і само усё зразумела і абяцала ім, што ніколі-ніколі не будзе прапускаць іх парады міма дзюбы, бо яны яму толькі на карысць. І шчаслівае сямейства буслоў паляцела да свайго гнязда.



**Малетина Нина Петровна**

## НАШ «САМОРОДОК»
(на правах рекламы)

Кто такие самородки?
Мы плывём как будто в лодке.
Море творчества кругом
А кружок второй наш дом.

Мы такие самородки
Пьём лишь чай – не надо водки.
Песни чудные поём,
Разговоры всё ведём.

Разговоры не простые,
Задушевные такие…
О поэтах и стихах,
О Земле и о цветах.

Да, у нас в библиотеке
Есть особенный кружок.
Если только ты не трусишь
Приходи-ка  к нам, дружок.